*В. А. Маляўка*

# Раскрыццё таямніцы ў аповесці У. Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха»

Дэтэктыўная аповесць «Дзікае паляванне караля Стаха» ўпершыню пабачыла свет у 1964 г. на старонках часопіса «Маладосць». Напісана ж яна была значна раней, яшчэ да вучобы У. Караткевіча ў Маскве. Як неабыякавы да лёсу свайго народа чалавек, У. Караткевіч балюча перажываў непапулярнасць беларускай літаратуры. Трэба было зацікавіць чытача «мясцовымі» творамі. Зразумела, што дэтэктыўны жанр — удалы варыянт дзеля рашэння гэтай задачы. Як зазначыў у свой час класік англійскага дэтэктыва Д. Чэстэрсан, «калі дэтэктывы чытаюць часцей, чым даведнікі, значыць, яны цікавей» [3, с. 78].

А. Адамаў у сваёй кнізе «Мой любімы жанр — дэтэктыў» паказвае тры асноўныя прычыны папулярнасці дэтэктыва. І першая прычына заключаецца ў таямніцы, якая знаходзіцца ў цэнтры сюжэту дэтэктыўнага рамана [1, с. 78].

У крытычнай літаратуры існуе вялікая колькасць тлумачэнняў для вызначэння паняцця дэтэктыўнага жанра. Але ўсе варыянты яднае асноўная жанраўтваральная адметнасць дэтэктыва — наяўнасць таямніцы або загадкі. Тут важна адзначыць, што пад загадкай не абавязкова разумеецца злачынства, тым больш забойства, і што наяўнасць злачынства зусім не адметнасць дэтэктыва.

У аповесці «Дзікае паляванне караля Стаха» ёсць таямніца, што звязана са злачынствам. Прадстаўнік роду Яноўскіх праз свае асабістыя карыслівыя мэты забівае прэтэндэнта на ўладу. Пісьменнік выкарыстоўвае прыём рэтраспекцыі. Крывавае забойства адбылося больш за сто гадоў таму назад, але аўтар звязвае падзеі мінулыя з часам, калі разгортваецца асноўная гісторыя аповесці, такім чынам, дадзеная таямніца становіцца вызначальным пунктам для разгортвання сюжэта аповесці.

Выпадкова ў закінуты куток Беларусі — Балотныя Яліны — трапляе інтэлігент, вучоны-фалькларыст, Андрэй Беларэцкі. У душы ён рацыяналіст, таму адмаўляецца верыць у людскія забабоны.

З першага раздзела аповесці пейзажныя замалёўкі ўводзяць чытача ў містыка-дэтэктыўны жанр твора. Пісьменнік кожным словам прымушае чытача баяцца за герояў аповесці. Немагчыма шчаслівае жыццё там, дзе «балотны скарлючаны лес», «сапраўдная і безнадзейная дрыгва» [2, с. 704].

Агульная карціна жаху, таямнічасці ствараецца з дапамогай мастацкіх дэталей. Гэтае абстрактнае паняцце мае вялікае змястоўнае значэнне. Холад як сімвал неверагоднага, жахлівага. Амаль што на кожнай старонцы гучыць

слова «жах». Ён цёмны, начны, апакаліптычны, тупы, незразумелы, смяротны, нясцерпны. Героі вар'яцеюць ад жаху, халадзеюць ад яго, дрыжаць. Моўная тканіна аповесці, такім чынам, насычана лексемамі, якія ствараюць агульны фон змрочнасці і невядомасці, таямнічасці і безвыходнасці.

З шостага раздзела тэмп дзеяння ў творы паскараецца. З гэтага часу Беларэцкі ўключаецца ў разгадку таямніцы Балотных Ялін. Рацыяналіст, смелы мужчына на сваёй шкуры адчуў небяспечнасць дзікага палявання, бачыў на ўласныя вочы Маленькага чалавека. Андрэй Беларэцкі выступае ў ролі сапраўднага следчага, які распачынае разблытваць клубок незразумеласці, што пануе вакол Надзеі Яноўскай.

Галоўная таямніца аповесці звязана з вобразам дзікага палявання, якое павінна пазбавіцца апошняй з роду Яноўскіх. Трэба адзначыць, што вобраз дзікага палявання з'яўляецца ключом для разумення ідэйнага напаўнення твора, роля дадзенага вобраза відавочная, бо ён пакладзены нават у назву аповесці.

А. Беларэцкі — герой з абвостранай ідэяй дабра і справядлівасці, таму імкнецца дамагчыся праўды. Як сапраўдны сышчык ён аналізуе факты, супастаўляе іх, каб адшукаць злачынцаў. Раскрыццё таямніцы дэтэктыва павінна патрабаваць пэўнай працы думкі, лагічнага мыслення. Чытаючы ідэальны дэтэктыў, чытач павінен больш-менш ясна ўсведамляць, у чым складаецца загадка, і мець усю неабходную для яе разгадкі інфармацыю. Але адказ на загадку павінен утрымлівацца ў гэтай інфармацыі ў схаваным, зашыфраваным выглядзе, інакш нам няма пра што «гадаць» і адказ на пытанне нельга будзе лічыць разгадкай. Мы, чытачы, разам з героямі шукаем доказы для раскрыцця таямніцы, робім тыя ці іншыя пралікі, падазраем нявінных і не бачым сапраўдных злачынцаў.

Трэба сказаць, што ад майстэрства пісьменніка залежыць, ці будзе паспяховай дэтэктыўная гісторыя. Але майстэрства ў Караткевіча было дастаткова. Перад аўтарам дэтэктыва стаіць складаная задача: ведаючы злачынца з самага пачатку, весці чытача да разгадкі паступова, раскідаць доказы, якія будуць блытаць, весці не ў тым кірунку. Значыць, пабудова дэтэктыва нагадвае люстэрка, у якім героі мадэлююць дзеянні, што адбыліся раней.

Галоўным доказам у разгадцы злачынства аказаўся ліст, знойдзены Беларэцкім у пакоі Свеціловіча. «Твой добразычлівы Лікол…» выманіў з дому Свеціловіча, пад выглядам Беларэцкага, і забіў яго. Згаданы ліст — яскравая адзнака дэтэктыўнага жанру: чытач мае магчымасць уключыцца ў аналіз тэксту, зрабіць свае высновы і меркаванні. Раскрыццё таямніцы абавязкова павінна суправаджацца разумовымі намаганнямі, скрупулёзнай працай чалавечага мыслення. Беларэцкі стараецца ўзнавіць тэкст ліста, які мог згарэць. Тэкст больш-менш быў расшыфраваны. Але хто такі «твой добразычлівы Лікол…»?

Пачуўшы гэтую мянушку, знаёмую з дзяцінства, Надзея «плакала ўзахлёб, як дзіцё. І праз рыданні нарэшце вымавіла: «Пан Лікол… пан Рыгор Дубатоўк». «Не можа быць! Што вы! Такі добры чалавек», — так думае Беларэцкі пра Дубатоўка [2, с. 758]. Гэта не што іншае, як адна з дэтэктыўных прыкмет, калі сапраўдны злачынца не падазраецца. Але хутка ўсё становіцца на сваё месца. Гарабурда аддаў Дубатоўку вэксалі на права валодання маёнткам Яноўскай, які мог належыць дзецям Надзеі ці яе мужу. Але хто ж ажэніцца з такой вар'яткай? «Але як я мог чакаць? Я ўвесь у вэксалях. Я такі няшчасны чалавек… Я падазраваў, што гэта злачынства. Але мая псарня», — апраўдваецца Гарабурда [2, с. 759]. Як мы бачым, гэта натура эгаістычная, ён пакрываў злачынства, каб самому жыць у дастатку. Такім чынам, Гарабурда быў саўдзельнікам злачынства, на чале якога стаяў Дубатоўк.

Знешне прыгожы, вясёлы чалавек у час выкрыцця паўстаў ужо ў зусім іншым абліччы: «Гэты твар быў жоўты, з моцна апушчанымі кутамі рота, з рэзкімі зморшчынамі ля носа. Вочы запалі, глядзелі мёртва і змрочна» [2, с. 784]. Дубатоўк трымаў у страху ўсё наваколле, жадаў смерці Яноўскай дзеля дасягнення сваіх мэт. Ён быў прывабным чалавекам, але з-за прагі да багаццяў страціў чалавечыя якасці. На гэта нам і ўказвае партрэт гэтага персанажа ў момант раскрыцця злачынстваў. Ягоны твар, як люстэрка, паказвае ўсю злосць гэтага персанажа, бо ён не змог давесці свае чорныя справы да канца.

Галоўная таямніца была раскрытая. Дубатоўк, карыстаючыся старажытнай легендай, хацеў давесці Яноўскую да вар'яцтва, каб атрымаць у спадчыну палац. Пад уладай Дубатоўка былі такія, як Гарабурда, Стахевіч, Варона і многія іншыя, а значыць тыя, хто ператварыўся ў бяздушную машыну, якая бачыць перад сабою толькі мэту, а сродкі дзеля дасягнення гэтай мэты выкарыстоўвае любыя, у большасці сваёй нізкія, у выніку чаго пралілося шмат крыві.

У. Караткевіч выявіў сябе як майстар напружанага, закручанага сюжэта, які пабудаваны па ўсіх канонах дэтэктыўнага жанру. І таямніца ў аповесці была не адна. Мастацкая дэталь «доўгія пальцы» дапамагла разгадаць яшчэ адну фантастычную з'яву ў доме Яноўскай. Пры першай жа сустрэчы з Берманам Беларэцкі заўважыў, што «пальцы ў яго былі тонкія і ў два разы даўжэй за нармальныя» [2, с. 717]. Тая ж асаблівасць цела была і ў брата Бермана, Малога Чалавека — «доўгія-доўгія пальцы».

А хто такая Блакітная Жанчына? Каб раскрыць гэтую загадку, нам трэба разгледзець сон Беларэцкага. Герой толькі адкрыў таямніцу Балотных Ялін, таму і ў сне перажывае мінулыя эмоцыі: «Нават у сне я жыў падзеямі ночы: бег, страляў, скакаў і адчуваў сам, што ногі мае рухаюцца, бягуць у сне» [2, с. 780]. Можам зрабіць выснову пра тое, наколькі герой жадаў дачакацца вырашальнага дня, калі праўда раскрыецца.

Беларэцкага зноў палохае нейкая здань дому Яноўскай. У. Караткевіч своеасаблівым чынам у канцы аповесці, калі ўжо, здаецца, вядомы фінал, заблытвае чытача. Блакітная Жанчына — герой-двайнік Надзеі. З дапамогай гэтага героя аўтар яшчэ больш пераканаў чытача ў тым, што гэтая дзяўчына знаходзілася на мяжы зрыву. Надзея баялася той, кім сама з’яўлялася. Яна не магла кантраляваць ужо не толькі свае думкі, але і цела. Гэта падкрэслівае эмацыйна зломлены псіхічны стан гераіні. З другога боку, вобраз-двайнік разбівае ілюзію фантастычнага, з якога, як здавалася, складаецца твор. Беларэцкі, як носьбіт аўтарскай ідэі, яшчэ на пачатку аповесці займае рацыяналістычную пазіцыю, якая і аказалася праўдзівай.

Як бачым, пісьменнік звяртаецца да фантастычнага сюжэта, нерэальных вобразаў, падзеі адбываюцца на памежжы зямнога. Але ў выніку ўсё знаходзіць канкрэтнае тлумачэнне, робіцца явай. Таямніцай у дэтэктыве лічаць толькі тое, што мае разгадку. У канцы дэтэктыва ўсе загадкі павінны быць высветлены, і разгадкі павінны адпавядаць загадкам. Мы лічым, што аўтар віртуозна змог прадумаць кожны элемент разгортвання сюжэта. Чытачы інтуітыўна, следам за Беларэцкім, разумеюць, што ёсць пэўны падвох у вобразах дзікага палявання, Малога Чалавека, Блакітнай Жанчыны, аднак аўтар не падпускае да разгадкі да фіналу аповесці, што і павінна мець месца ў сапраўдным дэтэктыве.

Разгадка таямніцы, выкрыццё злачынцаў, усталяванне справядлівасці — заканамерны фінал дэтэктыўнай гісторыі. Аднак пісьменніку цесна ў межах толькі чыстага дэтэктыва. Таму, на наш погляд, заключныя сцэны аповесці — гэта перамога над злом, якое ненавідзеў У. Караткевіч са сваімі гуманістычнымі поглядамі на жыццё. Менавіта таму супраць зла змагаюцца героі, якім вельмі сімпатызуе пісьменнік. Беларэцкі, Свеціловіч, Рыгор — сапраўдныя змагары, асобы адказныя, непахісныя, смелыя.

## Літаратура

1. *Адамов А.* Мой любимый жанр — детектив. Записки писателя. — Москва, 1980.
2. Беларуская літаратура / склад. У. В. Адамчык, М. В. Адамчык. — Мінск, 2004.
3. *Русецкі А.* Уладзімір Караткевіч: праз гісторыю ў сучаснасць: Нататкі літ. творчасці. — Мінск, 2000.